**Мы звяртаемся да камсамольцаў, да ўсёй моладзі краіны — азнамянуйце 60-годдзе Ленінскага камсамола новымі поспехамі! Дастойна працягвайце слаўныя традыцыі старэйшых пакаленняў, упарта авалодвайце ведамі і прафесіянальным майстэрствам, актыўна працуйце на вытворчасці, на ўдарных будоўлях пяцігодкі!**

(З пісьма ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ).


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (1191) 26 студзеня 1978 г. Цана 2 кап.


## ЗАПРАШАЮЦЬ ШКОЛЫ

**У 1978 годзе для маладых вучоных і спецыялістаў будуць праводзіцца ўсесаюзныя школы па актуальных праблемах навукі, тэхнікі і вытворчасці:**

па сістэмах кіравання маніпуляцыйных робатаў. Красавік, ММЛ «Растоў Вялікі» (Яраслаўск. вобл.);

па алергалогіі. Красавік, ММЛ «Растоў Вялікі»;

па актуальных праблемах сучаснай фізікі. Май, ММЛ «Растоў Вялікі»;

па праблемах міжнароднага маладзёжнага руху. Май, ММЛ «Растоў Вялікі»;

I школа па праблемах геахіміі. Май, Сібірскае аддзяленне АН СССР, інстытут геахіміі імя А. П. Вінаградава, г. Іркуцк;

IV школа па хіміі фосфаарганічных спалучэнняў. Май—чэрвень, ММЛ «Волга», г. Казань;

па аўтаматызацыі праектавання сродкаў вылічальнай тэхнікі і перспектывы выкарыстання мікрапрацэсаў. Май, ММЛ «Юнасць», г. Мінск;

III школа па лічбавых метадах рашэння задач матэматычнай фізікі. Май, ММЛ «Юнасць», г. Мінск;

II школа па тэорыі сістэм і яе дадатках. Май—чэрвень, ММЛ «Неорус» (Эстонская ССР);

па праблемах ідэалагічнай барацьбы. Чэрвень—жнівень, ВКШ пры ЦК ВЛКСМ, г. Масква;

па радыкальных рэакцыях арганічных спалучэнняў серы і іх значэнню для сінтэзу і практыкі. Верасень, ММЛ «Лясное возера» (Латвійская ССР);

па праблемах даследаванняў развіцця сацыялізму ў палітычнай эканоміі. Верасень, ММЛ «Лясное возера» (Латвійская ССР);

па рэактарах на цеплавых нейтронах. Кастрычнік, АЭС, г. Ленінград.

**Заявы для ўдзелу ва ўсесаюзных школах падаваць у камітэт камсамола БДУ, савет маладых вучоных. Тэл. 22-65-72, Няхайчык Н. В.**

У заяве ўказаць:

прозвішча, імя, імя па бацьку;

год нараджэння;

факультэт, кафедру;

спецыяльнасць;

тэму даследавання;

вучонае званне, вучоную ступень;

хатні адрас, тэлефон.

САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

**На пасяджэнні савета ветэранаў універсітэта, якое адбылося 20 студзеня, былі абмеркаваны пытанні: «Аб падрыхтоўцы да святкавання 60-годдзя Узброеных Сіл СССР» і «Аб правядзенні месячніка абаронна-масавай работы».**

**Па першаму пытанню выступілі Б. М. Глазкоў — загадчык ваеннай кафедры, І. В. Марчанка — дацэнт кафедры гісторыі БССР, А. Г. Бядэнка — падпалкоўнік ваеннай кафедры і іншыя.**

**Аб правядзенні месячніка савету далажыў старшыня камітэта ДТСААФ М. В. Гарлатаў.**

## ПАЛАЖЭННЕ

23 лютага 1978 года працоўныя нашай Радзімы будуць урачыста адзначаць 60-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі нашы доблесныя Узброеныя Сілы прайшлі гераічны баявы шлях і цяпер пільна выконваюць адказную задачу надзейнага стража мірнай працы савецкага народа, аплоту ўсеагульнага міру.

Рашэннем сакратарыята Белсаўпрофа, сакратарыята ЦК ЛКСМБ і бюро прэзідыума ЦК ДТСААФ БССР праводзіцца месячнік абаронна-масавай работы з 23 студзеня па 23 лютага 1978 года. У навучальных установах рашэннем ГК ДТСААФ месячнік прадоўжан да 1 сакавіка 1978 года.

**Асноўныя задачы месячніка такія:**

Усімі формамі і метадамі масава-палітычнай работы растлумачваць працоўным матэрыялы кастрычніцкага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС, нечарговай сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР, урачыстага пасяджэння ЦК КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвечанага 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Адлюстраваць у нагляднай агітацыі палажэнні Канстытуцыі СССР, юбілейных дакументаў, весці шырокую прапаганду ленінскіх запаветаў аб абароне сацыялістычнай Бацькаўшчыны, прапагандаваць слаўныя рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі Камуністычнай партыі, савецкага народа і яго Узброеных Сіл, патрабаванні Канстытуцыі СССР, патрыятычную дзейнасць абароннага таварыства;

павышаць узровень падрыхтоўкі моладзі да службы ва Узброеных Сілах, праводзіць масавыя абаронна-спартыўныя мерапрыемствы;

прыцягваць студэнтаў і супрацоўнікаў у рады ДТСААФ; развіваць і ўдасканальваць матэрыяльную базу для правядзення абаронна-масавай работы.

**У перыяд месячніка неабходна правесці ў кожнай арганізацыі:**

адзін-два тэматычныя вечары і не менш 2—3 лекцый і дакладаў па ваенна-патрыятычнай тэматыцы;

адзін-два паходы па месцах баявой, рэвалюцыйнай і працоўнай славы;

арганізаваць сустрэчы студэнтаў і супрацоўнікаў з Героямі Савецкага Саюза, ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, былымі партызанамі, воінамі Савецкай Арміі;

арганізаваць наведванні музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Кургана Славы, Хатыні і іншых памятных месц;

абнавіць наглядную агітацыю па ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Мець вітрыну газеты «Савецкі патрыёт» і куток ДТСААФ;

ажывіць работу гурткоў па ваенна-прыкладных відах спорту.

**Правесці спаборніцтвы:**

па кулявой стральбе (на першынство кафедры, факультэта) да 25 лютага; на першынство БДУ — 27—29 лютага;

па радыёспорту (на першынство факультэта) да 20 лютага, на першынство універсітэта — 20—22 лютага.

Для падвядзення вынікаў работы ў перыяд месячніка справаздачы аб праведзенай рабоце неабходна прадставіць да 1 сакавіка 1978 года:

прафгрупоргам агульнауніверсітэцкіх кафедр — у мясцком;

арганізацыям ДТСААФ факультэтаў сумесна з камітэтамі камсамола—у камітэт ДТСААФ універсітэта.

Лепшымі арганізацыямі ДТСААФ і прафгрупамі будуць лічыцца тыя, якія паспяхова выканаюць умовы месячніка.

Лепшыя арганізацыі ДТСААФ узнагароджвае камітэт ДТСААФ універсітэта. Лепшыя прафгрупы — мясцком універсітэта.







**НА ЗДЫМКАХ:** У час пасяджэння савета ветэранаў; выступае **Б. М. ГЛАЗКОЎ;** выступае **А. Г. БЯДЭНКА.**

## ПРАФСАЮЗ У ВНУ

**Абласны савет прафсаюзаў узнагародзіў знакам ВЦСПС «За актыўную работу ў прафгрупе» трох студэнтаў БДУ. Гэта Таіса КАЗЛОВА (геафак), Тамара СТРУК (мехмат), Алег ПАЛЯТАЕЎ (юрфак). Папросім іх падзяліцца асабістым вопытам і сваімі думкамі аб прафсаюзнай рабоце ў групе і на факультэце.**

НАШ КРУГЛЫ СТОЛ

**Т. СТРУК:** — Мы часта чуем словы: «Прафорг — зборшчык узносаў». Па-мойму, гэта прамы дакор тым прафоргам, якія не змаглі зацікавіць групу, абудзіць у ёй пачуццё калектывізму. Прафсаюзная і спартыўная работа, усемагчымыя культурна-масавыя мерапрыемствы могуць стаць сапраўды цікавымі, калі прафоргі будуць праводзіць іх не дзеля «галачкі» ў справаздачы.

**А. ПАЛЯТАЕЎ:** — Я згодзен з Тамарай. Хачу сказаць, што прафоргі не змогуць правільна выконваць сваю непасрэдную ролю, калі не будуць узгадняць работу з камсоргамі і старастамі. А збор узносаў — усяго толькі адзін з абавязкаў.

**— Якія канкрэтныя меры прымаюць прафбюро для павышэння паспяховасці і паляпшэння быту студэнтаў?**

**А. ПАЛЯТАЕЎ:** — Вучэбна-вытворчая і жыллёва-бытавая камісіі праводзяць рэйды наведвання лекцый і праверкі парадку ў інтэрнатах. Вынікі абмяркоўваюцца на пасяджэннях прафбюро. Мы запрашаем на гэтыя пасяджэнні прафоргаў груп, а яны непасрэдна ў групе абмяркоўваюць найбольш актуальныя пытанні.

**Т. КАЗЛОВА:** — На нашым факультэце прафбюро рэгулярна праводзіць дэкады і месячнікі выдатнай вучобы і наведвання лекцый. Часта вынікі праверак камісій паяўляюцца ў «Камсамольскім пражэктары» і «маланках». Вялікае значэнне для паляпшэння паспяховасці і быту мае правядзенне сумесных пасяджэнняў прафбюро і камітэта камсамола.

**— У чым вы бачыце галоўнае назначэнне прафсаюза ў ВНУ?**

**Т. СТРУК:** — Галоўная задача прафсаюза ў ВНУ адпавядае галоўнай задачы саміх навучальных устаноў — падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў.

**А. ПАЛЯТАЕЎ:** — Назначэнне прафсаюза як школы камунізму агульнавядома. Але прафсаюз у ВНУ мае сваю характэрную асаблівасць. У ВНУ прыходзяць вучыцца людзі розных узростаў, людзі розных сацыяльных груп. Таму прафсаюз павінен не толькі кантраляваць наведванне лекцый, але і выхоўваць новыя, камуністычныя адносіны паміж студэнтамі, выхоўваць чалавека з актыўнай грамадскай пазіцыяй.

**Т. СТРУК:** — Не ўсе студэнты знаёмы з прафсаюзнай работай так, як з камсамольскай. Гэта звязана, відаць, з тым, што ў камсамол мы ўступаем значна раней, чым у прафсаюз.

Я лічу, што трэба больш растлумачваць юнакам і дзяўчатам задачы прафсаюзнай арганізацыі, знаёміць іх з правамі і абавязкамі членаў прафсаюза.

А прафактывісты павінны падыходзіць да рашэння розных пытанняў па-дзелавому, з агеньчыкам. Вось тады студэнты не будуць разумець сэнс працы прафгрупоргаў толькі як збор узносаў.

Размову за «круглым сталом» вёў **В. ЕРМАКОЎ.**



# СЕСІЯ НА

## Завочнаму навучанню —

Выходзячы з рашэнняў Камуністычнай партыі СССР і Савецкага ўрада, якія праяўляюць вялікі клопат аб падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, рэктарат універсітэта, грамадскія арганізацыі, дэканат завочнага факультэта ўдзяляюць вялікую ўвагу пытанням завочнага навучання.

У падрыхтоўцы спецыялістаў па васьмі спецыяльнасцях прымае ўдзел больш як 70 кафедр універсітэта, якія прарабілі ў бягучым навучальным годзе значную работу па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі студэнтаў-завочнікаў.

На факультэце працуюць 26 прафесараў і 32 загадчыкі кафедр, 296 дацэнтаў і кандыдатаў навук, якія маюць вялікі стаж педагагічнай работы.

Кафедры сталі часцей праводзіць мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне арганізацыі вучэбнага працэсу і аказанне дапамогі студэнтам у іх самастойнай працы. Кафедры такіх аддзяленняў, як біялогія, правазнаўства, журналістыка, праводзяць вялікую работу па падбору кадраў прафесарска-выкладчыцкага саставу для працы з завочнікамі, сістэматычна абмяркоўваюць на сваіх пасяджэннях пытанні метадычнай работы на завочным факультэце. І вынікі гэтага могуць толькі радаваць: дастаткова адзначыць, што аддзяленне біялогіі па выніках паспяховасці за 1976-77 навучальны год займае першае месца на завочным факультэце.

Дэканатам завочнага факультэта сумесна з кафедрамі зроблена шмат для павышэння навукова-тэарэтычнага і ідэйна-палітычнага ўзроўню вучэбных заняткаў, умацавання сувязі навукі з вытворчасцю, з практыкай камуністычнага будаўніцтва.

З улікам спецыфікі завочнага навучання прыняты меры па скарачэнню перагрузкі студэнтаў, па ліквідаванню дубліравання. Многае зроблена па падрыхтоўцы вучэбна-метадычных дапаможнікаў, а таксама па забеспячэнню студэнтаў вучэбна-метадычнай літаратурай. У гэтым напрамку вялікую работу вядуць бібліятэка універсітэта, факультэцкія бібліятэкі і метадычны кабінет завочнага факультэта.

У практыку работы большасці кафедр трывала ўвайшлі абмеркаванні адкрытых лекцый, практычных заняткаў. У выкладанні часцей выкарыстоўваюцца тэхнічныя сродкі і наглядныя дапаможнікі; узмацнілся кантроль за працай студэнтаў у міжсесійны перыяд і ў першую чаргу шляхам больш дакладнага правядзення «дзён завочніка», шляхам паляпшэння рэцэнзіравання кантрольных і курсавых работ. Пытанні завочнага навучання сістэматычна заслухоўваюцца на пасяджэннях рэктарата і савета універсітэта.

Усё гэта садзейнічае павышэнню паспяховасці студэнтаў-завочнікаў, сярод якіх 1285 чалавек, здаўшых зімовую экзаменацыйную, і каля 800 чалавек — летнюю экзаменацыйную сесію толькі на добра і выдатна.

Сярод тых, хто сур'ёзна адносіцца да вучобы, да выканання сваіх абавязкаў, такія студэнты, як М. Гразнова (ІІ курс, аддзяленне гісторыі), М. Мажэйка (V курс, аддзяленне беларускай мовы і літаратуры), Л. Мацюк (IV курс, аддзяленне беларускай мовы і літаратуры), В. Куракоў (ІІ курс, аддзяленне гісторыі), А. Бужанкоў (IV курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), А. Яршова (ІІІ курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), С. Супруновіч (ІІІ курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), Ж. Краўцова (ІІ курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), В. Шулянкоў (V курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), Я. Сідарэвіч (V курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), А. Карніловіч (VI

Не паспелі адгучаць навагодні тосты, як у нас, студэнтаў-завочнікаў аддзялення правазнаўства, пачалася чарговая зімовая сесія. Пасля ўступных экзаменаў мы рэгулярна сустракаемся два разы ў год. Зараз мы на ІІІ курсе, і ў нас 5-я студэнцкая сесія.

Зноў сабралася разам наша 3-я група — людзі розных узростаў і прафесій: старшы ўчастковы інспектар з Пінска Аляксей Ляхавец, начальнік аддзялення міліцыі з гарадскога пасёлка Барань Віцебскай вобласці Алег Драгун, судавыканаўца

Зразумела, што студэнту-завочніку значна цяжэй «грызці граніт навукі», чым студэнту дзённай формы навучання. Сям'я, праца ды і ўзрост ужо не той. Таму, напэўна, мы з асаблівай удзячнасцю адчуваем увагу да сябе нашых выкладчыкаў, іх гатоўнасць заўсёды дапамагчы, не лічачыся з асабістым часам. Усіх, хто жыве недалёка ад Мінска, рэгулярна запрашаюць прыязджаць на кансультацыі, а калі няма магчымасці прыехаць — нам раяць пісаць на факультэт, і тады мы атрымліваем нават пісьмовыя кансультацыі. Мы

**НА ЗДЫМКАХ:**

Экзамен па крымінальнаму праву прымае ў студэнтаў-завочнікаў доктар юрыдычных навук, прафесар І. С. Цішкевіч.

Адказваюць студэнты 3 групы ІІІ курса аддзялення правазнаўства Анатоль Пашалюк і Ала Рэдута.

**Фота Т. САХАШЧЫК.**



# ЁСЦЬ КАЛЕКТЫЎ

з Кобрына Марыя Дацык, старшы юрысконсульт з Брэста Юрый Вярхозін, педагогі Ала Радзюк і Ала Рэдута, ваеннаслужачы Мікалай Міклашэвіч і іншыя. Як вы, мабыць, заўважылі, большасць нашых студэнтаў працуе па спецыяльнасці. Гэта, вядома, значна дапамагае ім у вучобе. У нас у групе так і лічыцца, што Юрый Вярхозін — «спецыяліст» па грамадзянскаму праву, Алег Драгун — па крымінальнаму, Ала Радзюк — па грамадскіх дысцыплінах. Таму іменна да іх часцей за ўсё нашы студэнты звяртаюцца за кансультацыяй, за дапамогай, калі сустрэлася незразумелае пытанне. І не толькі ў час сесіі. Калі, здараецца, зойдзеш у тупік на шляху самастойнай адукацыі, то і пісьмо таварышу напішаш, маўляў, выратоўвай, сябар! Ведаеш — дапаможа, падзеліцца.

Усе вельмі ўдзячны прафесару кафедры крымінальнага права І. С. Цішкевічу, якому мы толькі што здалі экзамен, за атрыманыя веды. І яшчэ мне асабліва хочацца падзякаваць выкладчыку кафедры нямецкай мовы З. А. Гудына. Цяжка ёй даводзіцца з намі, завочнікамі. Ёсць сярод нас такія, што закончылі школу год 15 назад. За гэты час замежную мову ўвогуле забысь можна. Але з дапамогай Зоі Антонаўны нешта ўспамінаем, нешта вывучаем нанава.

Урэшце, поспехі ў вучобе ў нас нядрэнныя. А ў вольны час (як ні дзіўна, але і ў студэнта-завочніка ў напружаны час сесіі выпадае вольная хвіліна) мы амаль усёй групай наведваем сталічныя кінатэатры, ужо арганізавалі культпаход у цырк, а ў час летняй сесіі абавязкова пабываем на футболе...

**А. ПАШАЛЮК,**
**студэнт-завочнік.**





**ГЕРТРУДА ШЧУР ПРАЦУЕ Ў РЭДАКЦЫІ РАЁННАЙ ГАЗЕТЫ БЕРАЗІНО І ВУЧЫЦЦА НА ЗАВОЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ БДУ НА АДДЗЯЛЕННІ ЖУРНАЛІСТЫКІ. ПІША ВЕРШЫ. У ПАЭТЫЧНЫХ РАДКАХ Г. ШЧУР СВАЯ ІНТАНАЦЫЯ — ІНТАНАЦЫЯ ШЧЫРАСЦІ, ЗАМІЛАВАНАСЦІ РОДНЫМ КРАЕМ; У ІХ — МАТЫВЫ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ.**

## ГОРСТЬ ЗЕМЛИ

Г. ШЧУР

Мой друг — далекий,
зарубежный,
Тебе на память подарю
Я горсть земли страны
безбрежной.
Не говори «благодарю»,
А сохрани навеки свято
От черных помыслов
вдали,
Как наивысшую награду,
Как символ дружбы —
горсть земли.
В ней жар сердец
непокоренных,
Кровавых войн жестокий
след.
В ней пепел узников
сожженных
И память вечная побед.
В ней доблесть и любовь
солдата.
Его последнее «Вперед!»
Последний выстрел
автомата
И слезы горькие сирот.
И нет мне ничего дороже,
Чем горсть земли моей
родной,
Пусть и тебе она поможет
Найти маяк во тьме
ночной.

# ЗАВОЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

## ● вялікую ўвагу

курс, аддзяленне біялогіі), А. Аўчарук (II курс, аддзяленне геаграфіі) і многія іншыя. Яны займаюцца толькі на выдатна.

На добра і выдатна паспявае 30 працэнтаў студэнтаў-завочнікаў, а многія з іх сумяшчаюць выдатную і добрую вучобу з выкананнем абавязкаў стараст. Яны з'яўляюцца сапраўднымі памочнікамі дэканата завочнага факультэта. Гэта В. Карэлін (V курс, аддзяленне гісторыі), А. Пупенка (VI курс, аддзяленне гісторыі), З. Дзарахохаў (II курс, аддзяленне журналістыкі), Я. Сідарэвіч (V курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), А. Ісакаў (III курс, аддзяленне гісторыі), А. Куксачоў (VI курс, аддзяленне геаграфіі) і іншыя.

Разам з тым мы яшчэ сутыкаемся з такімі студэнтамі, якія з году ў год застаюцца ў ліку адстаючых: Ж. Сысоева (VI курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), В. Сас (V курс, аддзяленне рускай мовы і літаратуры), А. Канцавая (V курс, аддзяленне геаграфіі), Н. Лагвіненка (VI курс, аддзяленне геаграфіі), Г. Шпакоўскі (VI курс, аддзяленне філасофіі), І. Кандратовіч (III курс, аддзяленне філасофіі), А. Карнейчык, М. Дурко (III курс, аддзяленне біялогіі), А. Кручанкоў (II курс, аддзяленне журналістыкі), З. Занкевіч (IV курс, аддзяленне беларускай мовы і літаратуры), В. Кашанскі (IV курс, аддзяленне біялогіі), Т. Квяткевіч (I курс, аддзяленне гісторыі), Т. Кужаль (II курс, аддзяленне гісторыі), а некаторыя ідуць на прамы падман выкладчыкаў, на розныя падлогі, як, напрыклад, студэнт III курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Л. Корвель. Атрымаўшы тройчы нездавальняючую адзнаку, па-махлярску пастараўся пазбегнуць сустрэчы з выкладчыкам, якому абавязан быў здаць экзамен.

На жаль, у цэлым яшчэ высокі працэнт студэнтаў, якія займаюцца толькі на здавальняюча. І прычыны гэтага, у першую чаргу, заключаюцца ў тым, што з боку кафедр слаба пастаўлен кантроль за самастойнай працай у міжсесійны перыяд. Аб гэтым сведчыць хаця б такі факт, як нездавальняючае рэцэнзіраванне кантрольных і курсавых работ. Нярэдка рэцэнзіраванне недапушчальна зацягваецца, і работнікі канцылярыі завочнага факультэта вымушаны па некалькі разоў напамінаць рэцэнзентам аб іх прамых абавязках; якасць рэцэнзій часам нізкая, у работах студэнтаў-завочнікаў застаюцца нявыпраўленымі памылкі. Тэматыка кантрольных і курсавых работ не заўсёды добра падабрана. Бывае, тэмы дубліруюцца, адсутнічаюць патрэбныя метадычныя ўказанні, у той час як кафедры павінны адносіцца з вялікай адказнасцю да гэтых пытанняў, улічваючы розныя ступені складанасці для студэнтаў розных курсаў, умовы іх працы і нават магчымасці карыстання літаратурай. Іменна таму студэнты-завочнікі ўсё яшчэ мала займаюцца навукова-даследчай работай, хаця магчымасці ў іх (вопыт практычнай работы і неабходная навукова-тэхнічная база) у шэрагу выпадкаў большыя ў параўнанні са студэнтамі стацыянара, а якасць работ, прадстаўляемых на конкурс студэнтамі-завочнікамі, нярэдка вышэй якасці работ студэнтаў дзённага аддзялення. Аб гэтым сведчаць і вынікі абароны дыпломных работ. Так, у мінулым навучальным годзе з 649 дыпломных работ 573 заслужылі добрыя і выдатныя (219 — выдатныя, 354 — добрыя) адзнакі.

Наша задача заключаецца ў тым, каб найхутчэй ліквідаваць недахопы, агульнымі намаганнямі палепшыць арганізацыю вучэбнага працэсу на завочным факультэце, садзейнічаць таму, каб бягучая лабараторна-экзаменацыйная сесія прайшла на высокім узроўні.

**Н. МАЖЭЙКА,**
**дэкан завочнага факультэта.**

Не без гумару

## СВЯТА ДВА РАЗЫ Ў ГОД

Для студэнтаў-завочнікаў сесія — гэта свята. За некальні тыдняў да яе пачатку пачынаеш рыхтавацца да будучых залікаў і экзаменаў, кожны дзень жывеш з радасным пачуццём набліжэння сесіі. З-за хвалявання знікае сон і апетыт, перастаеш пазнаваць родных і знаёмых пры сустрэчы, у аўтобусе становішся з усімі ветлівы (раптам разам з табой едзе будучы экзаменатар!). Нарэшце — развітанне з любімай жонкай і сустрэча з любімымі выкладчыкамі. І вось ты ўжо стаіш перад дзвярыма аўдыторыі, ачышчаеш кішэні ад старых пракампасціраваных талонаў і запаўняеш іх пэўнымі атрыбутамі студэнцкага жыцця: шарыкавымі ручкамі і чыстай паперай. Адчыняеш дзверы і...

Калі студэнт-завочнік «завальвае» экзамен, не думайце, што ён не вучыў, што ў яго падручніку такога не было або што ён спаў на лекцыях. Проста студэнт яшчэ раз марыць сустрэцца з любімым прафесарам і дзеля гэтага крыху хітруе і робіць выгляд, што нічога не ведае. Але не ўсім гэта ўдаецца, і большая частка студэнтаў усё-такі ўходзіць з экзамена з адзнакай у залікоўцы. Нічога, калі гэта адзнака «здавальняюча», а то бывае «добра» і яшчэ горш — «выдатна». Я дрэнны стараста групы, таму што жадаю ўсім сваім студэнтам толькі гэтых жудасных «выдатна». І не толькі ў зімовую сесію, але і летам.

**І. ЖАЛНЕРЧЫК.**



● **НА ЗДЫМКАХ:** Спецкурс па навуковаму камунізму чытае шасцікурснікам аддзялення філасофіі завочнага факультэта дацэнт кафедры навуковага камунізму І. Н. Смальцар.

**Фота Т. АЛЯКСАНДРАВАЙ.** ●



## НАБЫВАЮЧЫ ВЕДЫ

Заканчваецца зімовая экзаменацыйная сесія — напружаны і адказны момант у жыцці студэнтаў-завочнікаў. Ззаду засталіся хваляванні і трывогі. Многія студэнты нашай групы здалі экзамены толькі з адзнакамі добра і выдатна. І гэта заканамерны вынік для тых, хто на працягу ўсяго семестра сістэматычна займаюцца, павышаючы ўзровень сваіх ведаў, хто не прапускаў заняткаў. Гэта студэнты Я. Дзяньковская, А. Лебедзеў, А. Спірагін, Р. Нягацін і іншыя. Яны не толькі самі добра здаюць экзамены, але аказваюць дапамогу і сваім таварышам у падрыхтоўцы да экзаменаў, растлумачваюць ім тыя ці іншыя пытанні.

На лепшых імкнецца раўняцца ўся група. Так яно і павінна быць, бо кожны з нас паступаў у ВНУ для таго, каб папоўніць свой багаж ведаў, а, атрымаўшы іх, выкарыстаць на практыцы.

Многія студэнты групы—гэта работнікі органаў суда, пракуратуры, органаў унутраных спраў, і вучоба ва універсітэце, натуральна, станоўча сказваецца на іх рабоце.

З першага курса наша група застаецца стабільнай, дружнай. Але ў нас ёсць і свае цяжкасці, нявырашаныя задачы. Неабходна палепшыць наведванне лекцый, павысіць адказнасць студэнтаў за падрыхтоўку да экзаменаў і залікаў.

Пераадольваючы цяжкасці, мы поўныя рашучасці паспяхова скончыць універсітэт і з максімальнай аддачай сіл прыкласці свае веды на практыцы.

**А. ШУПТА,**
**стараста 1-й групы III курса завочнага факультэта аддзялення правазнаўства.**

## СЕЛЬСКІ НАСТАЎНІК

**— Хто першы адказваў на экзамене?**
**— Енчык. І, як заўсёды, паспяхова.**

(З размовы ў калідоры).

Калісьці актрыса Вера Марэцкая стварыла ў кіно цудоўны вобраз сельскай настаўніцы — чалавека, чулага да людзей, моцнага характарам, адданага школьнай справе. Вобраз сельскага настаўніка ўвайшоў у нас лірычнай пранікнёнай нотай. Гэты чалавек, верылі мы, не толькі вучыць вясковых дзяцей разумнаму і вечнаму. Ён добра ведае быт сялян, іх клопаты, умовы, у якіх жывуць яго вучні. Іменна такія настаўнікі становяцца настаўнікамі жыцця.

Праходзяць дзесяцігоддзі. Ужо колькі раз змянілася школьная праграма, а сельскі настаўнік усё тоіі жа. «Ды дзеці не тыя,—уздыхае Тадэвуш. — Цяжка стала ў школе працаваць — гэта ўсе адзначаюць. У чым цяжкасць? Дысцыпліна? Не, у мяне ў класе парадак, слухаюць уважліва. Але неяк апатычна, без агеньчыка». І расказвае аб тым, як стараецца зацікавіць падапечных.

Тадэвуш — настаўнік са стажам. Закончыў Ваўкавыскае педвучылішча, выкладаў у пачатковых класах. Пасля арміі вёў у старшакласнікаў філалогію — беларускую мову і літаратуру (не хапала настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй). Цяпер вядзе заняткі па працы і фізічнай культуры, выкладае біялогію. Енчык у гэтым годзе заканчвае універсітэт (зараз ён вучыцца на VI курсе аддзялення гісторыі завочнага факультэта), будзе выкладаць гісторыю, грамадазнаўства. Ужо кароткі пералік прадметаў — ад філалогіі да фізкультуры —сведчыць аб шырокім дыяпазоне ведаў і педагагічных здольнасцей Тадэвуша Іванавіча. І гэта адна з адметных рыс сельскага настаўніка. Ён майстар на ўсе рукі. Можа замяніць захварэўшага калегу, знойдзе агульную мову з любой узроставай групай дзяцей.

— Я нарадзіўся ў Оцкавічах, вучыўся ў Оцкавічах, працую ў Оцкавічах. Ведаю не толькі кожнага чалавека сваёй вёскі — радаслоўную сем'яў. Мае абавязкі не канчаюцца за ганкам школы. Я заўсёды настаўнік — ці то на вуліцы, ці то ў класе. Не адчуваю сябе прыватнай асобай нават у Мінску на сесіі.

Оцкавіцкая васьмігадовая школа Пастаўскага раёна — яго дом, яго лёс. Яна невялікая, негаманкая, як і ўсе вясковыя школы; вучыцца тут каля шасцідзесяці дзяцей з Оцкавіч і суседніх вёсак. Раніцой яны ідуць разам — вучні і настаўнікі, абменьваюцца навінамі, жартуюць. Настаўнікі ідуць на працу, вучні... Што ж, вучні — таксама, бо вучоба — тая ж праца, вельмі напружаная і складаная. У Тадэвуша два віды працы спалучаны: ён вучыць і вучыцца сам. Мы заўсёды гаворым, што гэта цяжка. Хлеб завочніка абліты потам. У сувязі з гэтым я задаю Енчыку «правакацыйнае» пытанне: «Хоць раз за шэсць гадоў вучобы было жаданне кінуць універсітэт?» — «Не!»

— Вучыцца на завочным цяжка — усе ведаюць. Таму і дапамагаюць завочніку. У школе да мяне адносіны асаблівыя — калегі разумеюць складанасці шляху да дыплома і стараюцца не вельмі загружаць працай. Дома — сям'я (сыну пяць гадоў), хатняя гаспадарка. Але і тут я адчуваю клопат і падтрымку. Так што ўсё залежыць ад мяне самога, як я сплануюю свой час, перамагу ляноту, здолею здаць экзамены.

Тадэвуш расказвае проста і сціпла. Здаецца, я бачу яго ля школьнай дошкі, чую, як гэткім жа роўным голасам ён вядзе ўрок, выбіраючы самыя зразумелыя, простыя словы, тлумачыць вучням матэрыял. А пасля ўсіх дзённых спраў сам садзіцца за падручнік, каб пазнаць «премудрость скучных строк».

Рэгулярнасць самастойных заняткаў — вось яго дэвіз, своеасаблівае крэда. Яно дапамагло Тадэвушу Енчыку паспяхова вучыцца, паспяхова напісаць дыпломную работу — «Матэрыялы партызанскага руху ў Пастаўскім гісторыка - краязнаўчым музеі».

...Калідор сустрэў яго вельмі шумна. Пасыпаліся пытанні сяброў. Расчырванелы ад хвалявання, ён гартаў залікоўку і ніяк не мог знайсці апошні запіс экзаменатара (група Тадэвуша здавала гісторыю філасофіі). А потым нетаропка і сціпла расказваў таварышам пра білет, пра настрой выкладчыка, пра... Хоць гэта і апошняя сесія, але хвалюе яна не менш, чым першая. А колькі іх будзе яшчэ ў жыцці — экзаменаў і выпрабаванняў. Адолее? Павінен, такі ўжо характар у сельскага настаўніка.

**Н. НІКОЛІЧ.**

Раскажу пра таварыша

# ЖЫВЕ ТАКАЯ ДЗЯЎЧЫНА

Два гады назад Алена Мялешка скончыла школу. Працуе на будоўлі. На журфак прыйшла невыпадкова. Але чаму іменна на вячэрняе аддзяленне? У школе Алена вучылася добра, і ёй не складана было б паступіць на стацыянар. Да таго ж вучыцца і працаваць — працаваць будаўніком — цяжка. Тады здзівілася Алена: а вопыт? Звычайны жыццёвы вопыт? Як ён патрэбен журналісту! «Не ведаючы людзей, я не змагу добра пісаць аб іх»,— сказала Алена.

Пытанне «кім быць?» было вырашана ёю яшчэ ў школе. Заставалася адно: выбраць шлях да ажыццяўлення мары. Прасцей за ўсё было накіраваць дакументы ў Беларускі універсітэт на факультэт журналістыкі. Ды засмучала дзяўчыну адсутнасць усё таго ж жыццёвага вопыту. Дакладней, недахоп яго. А каб набыць больш «мудрасці», вырашыла Алена паступіць у ... мараходку, каб потым папрацаваць на моры, а калі пашанцуе, то прыняць удзел у кругасветным плаванні.

Хто з нас у семнаццаць год не марыў пра пунсовыя ветразі, але, згадзіцеся, нямногія па-сапраўднаму шукалі іх.

...Усе летнія канікулы пасля IX класа Алена працавала, каб зарабіць грошы на паездку ў вучылішча, а атрымаўшы атэстат, паехала ў незнаёмы горад. Паспяхова прайшла медкамісію, хоць і давялося трохі схітраваць (ведаючы, што мае не зусім добры зрок, Алена загадзя вывучыла напамяць усю табліцу акуліста). Экзамены яна вытрымала. Здавалася, вось яно — мора. Але, на жаль, не хапіла адной-адзінай паперкі: ці то характарыстыкі, ці то пасведчання. Прыйшлося вяртацца дадому.

Алена не кінулася ў роспач. Даведалася, што можна паехаць працаваць на будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі, і пайшла ў райком за пуцёўкай.

...Калі я пытаюся аб яе жыцці на камсамольскай будоўлі, яна заўсёды расказвае пра сваіх сяброў. Зараз яны абменьваюцца цёплымі пісьмамі, успамінаюць тыя цудоўныя дні сумеснай работы на БАМе.

На будоўлі горада Мінска, дзе зараз працуе дзяўчына, яе паважаюць за працавітыя рукі, за той агеньчык душы, які не дае дзяўчыне спакою. Камсамольцы абралі Алену Мялешка сваім камсоргам. Клопатаў прыбавілася. Але дзяўчына паспявае і кніжку пачытаць, і ў тэатр схадзіць, і вершы пісаць. Выдалася некалькі вольных дзён — і Алена ляціць у Ленінград. Любіць паблукаць па незнаёмым горадзе, паразважаць, памарыць, а, вярнуўшыся дадому, падзяліцца з сябрамі ўражаннямі, думкамі і новымі вершамі.

Цікавы чалавек Алена.

**Н. СКОКАВА,**
**студэнтка.**

АЛІМПІЙСКІМ АБ'ЕКТАМ — КАМСАМОЛЬСКІ КЛОПАТ І ЎВАГУ

# АБ'ЯЎЛЕН КОНКУРС

Камітэт камсамола фізічнага факультэта аб'яўляе конкурс на лепшую эмблему для лінейнага студэнцкага будаўнічага атрада, які будзе працаваць на ўзвядзенні алімпійскіх аб'ектаў горада-героя Мінска.

ЭМБЛЕМА ПАВІННА АДЛЮСТРАВАЦЬ:

1. Спецыфіку студэнцкага будаўнічага руху.
2. Алімпійскую накіраванасць будоўлі.

Эскізы эмблемы падаваць у п. 382 фізічнага корпуса (Падвербнаму В.) да 15 красавіка 1978 г. Пераможца конкурсу ўзнагароджваецца алімпійскім сувенірам.



На здымку: супрацоўнікі кафедры біяфізікі ў час суботніка на стадыёне «Дынама». Фота **В. Падвербнага.**

# ШЧАСЛІВАГА ВЫЙГРЫШУ

Апошнія тыражы «Спортлато» і «Спортлато-2» 1977 года сталі шчаслівымі для многіх удзельнікаў гульні.

Пенсіянерка К. В. Цемнікава, інжынер М. Ф. Кед у 51-м тыражы правільна адгадалі 5 нумароў. Сума выйгрышу — 5000 рублёў.

Слесар Мінскага аўтамабільнага завода У. В. Пасюк і настройшчык радыёапаратуры П. А. Гутыра за правільна адгаданыя 5 нумароў атрымаюць па 3811 рублёў.

Асаблівым тыражом стаў 52-гі тыраж для І. К. Міхейчыкава, работніка ўпраўлення «Мінводаканалтрэста». Ён правільна адгадаў у адной картачцы 5 нумароў, у пятнаццаці картачках па 4 нумары і ў трыццаці трох па 3 нумары. Агульная сума выйгрышу склала 5131 рубель.

На жаль, сярод удзельнікаў гульні сустракаюцца і тыя, хто парушае правілы гульні і пазбаўляе сябе выйгрышу. Запаўняюць толькі адну іграву частку «Б», а частку «В» пакідаюць незапоўненай, закрэсліваюць больш шасці, а па «Суботнему спортлато» больш пяці нумароў, дапускаюць падчысткі і выпраўленні, нясвоечасова апускаюць часткі «Б» і «В» у скрынку «Спортлато».

У кожнай гульні ёсць свае правілы. У «Спортлато»— строгія правілы. Ад удзельнікаў гульні патрабуецца адно: быць уважлівымі.

**В. НІКАЛАЕВА,**
**старшы інструктар Беларускага рэспубліканскага ўпраўлення «Спортлато».**

Лісток ДАІ

# ХУТКАСЦЬ, ХУТКАСЦЬ...

У вуліцы свае законы: яны патрабуюць высокай дысцыпліны, пастаяннай увагі і назірання за навакольнымі абставінамі. На жаль, ёсць вадзіцелі, якія не выконваюць гэтых правілаў, груба парушаюць іх.

Як вядома, сучасныя аўтамабілі могуць развіваць вялікую хуткасць, аднак гэтыя якасці патрэбна правільна выкарыстаць. Вадзіцель павінен выбіраць хуткасць з улікам асаблівасцей праезджай часткі і пагодных умоў, дзеянняў іншых вадзіцеляў і паводзін пешаходаў з такім разлікам, каб можна было спыніць транспарт ва ўсіх выпадках, калі ўзнікае небяспека для руху.

Аналіз дарожна-транспартных здарэнняў паказвае, што небяспеку ўяўляе не высокая хуткасць, а перавышэнне яе ў пэўных умовах. Прывядзём даныя статыстыкі: у 1976 годзе па віне «хуткасці» ў Мінску адбылося 19 дарожна-транспартных здарэнняў, пры якіх загінула 5 і атрымала раненні 35 чалавек. Як бачна, лічба салідная і заслугоўвае ўвагі. Застаецца высокая лічба здарэнняў па віне «хуткасці» і ў 1977 годзе. Толькі за 5 месяцаў па гэтай прычыне адбылося 10 дарожна-транспартных здарэнняў, 1 чалавек загінуў і 11 атрымалі траўмы. Акрамя таго, шмат вадзіцеляў дапускаюць парушэнні хуткасных рэжымаў пры руху. Работнікамі міліцыі і грамадскасцю за 5 месяцаў 1977 года выяўлены 6383 факты перавышэння хуткасці руху вадзіцелямі.

Напрыклад вадзіцель матацыкла Лабовіч, рухаючыся па вуліцы Каліноўскага на перавышанай хуткасці, не справіўся з кіраваннем, ударыўся ў асвятляльную мачту. Лабовіч загінуў, а двое грамадзян, якія знаходзіліся побач, атрымалі раненні. Можна прывесці шмат прыкладаў, але ў гэтым няма неабходнасці. Патрэбна напомніць, што з 1 студзеня 1976 года ўведзена абмежаванне хуткасці:

у населеных пунктах для ўсіх транспартных сродкаў не больш 60 км/г.;

на дарогах па-за населенымі пунктамі для легкавых, міжгародніх і турыстычных аўтобусаў і грузавых аўтамабіляў з дазволенай максімальнай вагой больш 3,5 тоны, а таксама для ўсіх легкавых і грузавых аўтамабіляў, якія кіруюцца вадзіцелямі з вадзіцельскім стажам да 2-х гадоў, не больш 70 км/г.;

для транспартных сродкаў, якія здзяйсняюць перавозкі цяжкавагавых аўтакранаў, самаходных машын і механізмаў у населеных пунктах і па-за імі не больш 50 км/г.;

для транспартных сродкаў, якія здзяйсняюць перавозкі цяжкавагавых і негабарытных грузаў, з хуткасцю, не больш устаноўленай Дзяржаўтаінспекцыяй пры ўзгадненні ўмоў перавозкі.

**Н. РАБЫ,**
капітан міліцыі, супрацоўнік ДАІ УУС Мінгарвыканкома.

ГУМАР ● ГУМАР

## В НАРОДЕ ГОВОРЯТ:

День сессии семестр кормит.

Сессия хорошо, а каникулы лучше.

Пуганый студент и зачета боится.

Остер топор, да и студент зубаст.

Экзаменатор слезам не верит.

Не так отвечай, как хочется, а так, как в лекции писано.

Искру туши до пожара, шпаргалку пиши до экзамена.

Одна паршивая тройка всю зачетку портит.

Семь раз оглянись, один — спиши.

В дареном конспекте на почерк не смотрят.

Экзаменатору закон не писан.

Экзамен сдать — не лекцию прогулять.

Списать — не напасть, а как бы, списавши, не пропасть.

После экзамена кулаками не машут.

Экзамены сдают — стипендии летят.

АДКАЗЫ НА КРАСВОРД, ЗМЕШЧАНЫ 12 СТУДЗЕНЯ 1978 г.

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 4. «Раніца». 5. Яга. 6. Трактат. 10. Берлін. 13. Пічэта. 15. Фактура. 18. Кам. 19. Рэгата.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Фацэт. 2. «Пратон». 3. Юнга. 6. Бор. 8. Кліч. 9. Агат. 11. Елка. 12. Ліст. 13. Плакат. 14. Эрг. 16. Крэда. 17. Уран.

**У КАБІНЕТ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ НАВУК ПАСТУПІЛА НАСТУПНАЯ ЛІТАРАТУРА:**

**ГІСТАРЫЧНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ**

1. Сусветная гісторыя, т. XI. Пад рэд. **А. А. Чубар'яна** (адк. рэд.) і інш. М., «Мысль», 1977.
2. Штогоднік германскай гісторыі. 1976 год. М., «Наука», 1977.
3. Французскі штогоднік. Артыкулы і матэрыялы па гісторыі Францыі. 1975 год. М., «Наука», 1977.
4. Вайна за незалежнасць і ўтварэнне ЗША. Пад рэд. **Г. Н. Севасцьянава.** М., «Наука», 1976.
5. **Йожа А., Мілеі Д.** Венгерскія інтэрнацыяналісты ў барацьбе за перамогу Кастрычніка. М., «Прогресс», 1977.
6. Саюз камуністаў. 1836—1849. Зборнік дакументаў. М., «Мысль», 1977.
7. **Карванен Тайво.** Савецкі Саюз і Фінляндыя: супрацоўніцтва, добрасуседства. М., «Прогресс», 1977.
8. **Кудачкін М., Барысаў А., Ткачэнка В.** Чылійская рэвалюцыя: вопыт і значэнне. М., Политиздат, 1977.
9. СССР і Польшча. Інтэрнацыянальныя сувязі — гісторыя і сучаснасць. У 2-х тамах, т. І. М., Политиздат, 1977.
10. Сучасная Азія. Дапаможнік. М., Галоўная рэдакцыя ўсходняй літаратуры выдавецтва «Наука», 1977.
11. ГДР. Станаўленне і рост. Да гісторыі ГДР. М., «Прогресс», 1977.
12. Гісторыя і культура антычнага свету. М., «Наука», 1977.
13. **Раеўскі Д. С.** Нарысы ідэалогіі скіфа-сакскіх плямёнаў. Вопыт рэканструкцыі скіфскай міфалогіі. М., Галоўная рэдакцыя ўсходняй літаратуры выдавецтва «Наука», 1977.
14. Станаўленне класаў і дзяржавы. Зборнік артыкулаў. М., «Наука», 1976.
15. Расы і народы. Сучасныя этнічныя і расавыя праблемы. Штогоднік. Вып. 7. 1977. М., «Наука», 1977.
16. **Маркаў Г. Я.** Качэўнікі Азіі. Структура гаспадаркі і грамадскія арганізацыі. М., Выдавецтва МДУ, 1976.
17. **Антылогаў Г. Н.** Ніжагародскія дакументы XVI ст. (1588 — 1600). М., Выд-ва МДУ, 1977.
18. Інвентары магнацкіх уладанняў Беларусі XVII—XVIII ст. Уладанне Смаргонь. Мн., «Навука і тэхніка», 1977.
19. **Спірын Л. М.** Крушэнне памешчыцкіх і буржуазных партый у Расіі. (Пачатак XX ст. — 1920 г.). М. «Мысль», 1977.
20. **Прахарэнка Я. Н., Рыжыкаў В. Т.** Грозна шумела пушча. Мн., «Беларусь», 1977.
21. Тыл Савецкіх Узброеных Сіл у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. Пад агульнай рэдакцыяй **С. К. Куркоткіна.** М., Воениздат, 1977.
22. Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны. VII. Л., Ленінградскае аддзяленне выдавецтва «Наука», 1976.
23. Пытанні гісторыі. Міжвузаўскі зборнік. Вып. IV. Мн., Выд-ва БДУ, 1977.
24. **Палтарак Д. І.** Тэхнічныя сродкі ў выкладанні гісторыі і грамадазнаўства. Дапаможнік для настаўнікаў. М., «Просвещение», 1976.
25. Гісторыя сярэдніх вякоў. У 2-х тамах. Выд. 2-е, перапрацаванае. Пад агульнай рэдакцыяй **С. Д. Сказкіна.** Т. 1 і 2. М., «Высшая школа», 1977.

**Н. СЛАВІНСКАЯ.**

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС
220030. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 00041 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 153.